Уладзімір Пракапцоў

# СОНЕЧНЫ ЗАЙЧЫК НАД ЗАМКАМ

З выставы мастака Уладзіміра Рынкевіча

Апошні прамень. Акварэль, 1992.

На супакой. Акварэль, 1992.





У варунках нацыянальнага адраджэньня прыкметнае месца належыць віцебскай мастацкай школе. Пакрысе мы ўсьведамляем ролю Віцебска, яго мастацкага асяродка ў культурным жыцьці рэспублікі, іх уплыў на сусьветнае мастацтва на пачатку дваццатага стагодзьдзя.

Выпускнікам мастацка-графічнага факультэта Віцебскага педінстытута было наканавана прадоўжыць традыцыю майстроў старэйшага пакаленьня. Калі-ж гаворка пра акварэль, то адметнасьць віцебскай школы ў гэтым жанры мастацтва наогул цяжка пераацаніць. На жаль, няма пакуль грунтоўнай навуковай працы, якая-б усебакова раскрывала феномен віцебскай акварэлі. Можна доўжыць пералік акварэлістаў, якія добра вядомы ня толькі ў нас, але й за межамі Беларусі.

Сярод іх — Уладзімір Рынкевіч. Яго імя не абыдзена ўвагай мастацтвазнаўцаў. Амаль два дзесяцігодзьдзі (пасьля заканчэньня ў 1974 г. мастацка-графічнага факультэта) ён працуе як мастак-акварэліст, удзельнічае ў шматлікіх выставах (з 1991 г. — член Саюза мастакоў Беларусі). Дзесяць гадоў выкладае й вядзе практычныя заняткі па акварэлі ў Менскім інстытуце культуры, кандыдат мастацтвазнаўства, дацэнт. Персанальная выстава ў Доме работнікаў мастацтваў пацьвердзіла высокі прафесійны ўзровень майстра, самабытнасьць яго творчага мысьленьня, хоць ня ўсе графічныя аркушы былі раўназначныя.

Па-першае, хацелася-б адзначыць адыход мастака ад традыцыйнай манеры экспанаваньня. Выстава складалася з 40 работ апошняга года дзейнасьці, аб'яднаных у своеасаблівую аўтарскую

Восеньскі букет. Акварэль, 1992.

Каля сьцен Мірскага замка. Акварэль, 1992.





споведзь, — нізкі аркушаў «Сьведкі гісторыі», «Асеньні букет», «Вясковыя матывы», «Сем сонцаў».

Някідкая, стрыманая гама нацюрмортаў з букетамі кветак, травы, лістотай па-рознаму ўспрымаецца ў мностве кампазіцыйна-каларыстычных варыяцый. Аўтар здольны адысьціся ад ілюстрацыі рэчаў, наблізіцца да асацыятыўнасьці і сімвалічнасьці, з аднаго боку, і мяккай, паэтычнай колеравай напеўнасьці — з другога. Пры гэтым адсутнічае нават імпэт да чыста тэхналагічнага эфекту зь бязьмежнымі магчымасьцямі акварэлі, асабліва тэхнікі «па мокрай паперы». Тут нібыта і міг надзеі, сьвятла, радасьці, і водбліск юнацкай пары («Сонечны зайчык»), і ўспаміны, і дотык да сваіх каранёў («Бабіна лета»).

У бяздухоўным атачэньні сёньняшняга дня, калі некаторыя мастакі спрабуюць падладзіцца пад густ каньюнктуры так званага рынку, Уладзімір Рынкевіч імкнецца засьведчыць духоўнасьць як адзін з найвышэйшых чыньнікаў нашага Адраджэньня. Менавіта духоўнасьць зьяўляецца вяртаньнем да вечнага й істотнага. Гэта ня толькі абуджэньне ад летаргічнага сну, але й мастакоўскі погляд на шматграннасьць жыцьця ва ўсіх яго праявах («На ростанях»), і пранізьлівае пытаньне: хто мы такія? Як мне падалося, перакананьны адказ — у нізцы «Сьведкі гісторыі» з краявідамі помнікаў нашай мінуўшчыны («Мірскі замак», «Стары замак» і інш.). Разам з мастаком узьнімаемся над будзённасьцю, бо насуперак натуральнаму закону незваротнасьці часу ён лучыць сучаснасьць, мінуўшчыну й будучыню. Сімвалам гэтае лучнасьці ўяўляецца па-мастацку дасканалая серыя мірскіх краявідаў. Тут

Вясковая вуліца. Акварэль, 1992.



характво беларускага пейзажу, любы нашаму сэрцу помнік, а празь іх жывое цяпло — далучэньне да часоў мінулых і да часоў наступных. У гэтым і заключаецца самакаштоўнасьць твораў Рынкевіча.

Зьнешняя лёгкасьць, кампазіцыйная й колеравая вытанчанасьць акварэльных аркушаў, нягледзячы на іх камерныя памеры, дазволілі мастаку найбольш поўна выявіць сябе і ў нізках «Сем сонцаў», «Вясковыя матывы». Дарэчы, ён бачыць сваю задачу ў дасканалым валоданьні тэхнічнымі прыёмамі як шляхам да сапраўднай свабоды карыстацца жывапіснай моваю — колерам, плямай. Гэтую аксіёму, прыгадвае мастак, ён засвоіў ад настаўнікаў-педагогаў — В. М. Лук'янава і Ф. Ф. Гумена.

Радуе, што Рынкевіч не абмяжоўваецца «абжытай» і таму «вернай» праблематыкай. Штогадовыя творчыя вандроўкі зь сябрамі-мастакамі па Беларусі, а таксама летнія пленэры са студэнтамі не даюць яму застацца ў коле апрабаваных навыкаў. Яго графічныя аркушы, якія прыемна вылучаюцца сваёй характэрнасьцю, уласным стылем, заўсёды пазнаеш на рэспубліканскіх выставах. Тая ці іншая доля творчага эксьперыменту заўсёды вабіць шчырага мастака. Рынкевіч не баіцца страціць «рэнаме», а сьвядома йдзе на такі эксьперымент. Гэта зноў-жа пераканальна засьведчыла выстава. Больш таго, зрабіць мастакоўскую справаздачу з твораў аднаго толькі года, апошняга года ня кожнаму мастаку пад сілу. Лейтматыў персанальнай выставы Уладзіміра Рынкевіча — духоўная повязь з роднай зямлёй, са спадчынай продкаў. І тое, што ён па-ранейшаму ў пошуках, — зарука новых посьпехаў і, ведама-ж, адкрыцьцяў.

Сакавік. Акварэль, 1992.





У чаканьні вясны. Акварэль, 1992.